ПА-СУСЕДСКУ, ПА-СЯБРОЎСКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз паўтарыў: «Мы не просімся ні пасярэднікамі, ні міратворцамі. Мы проста за вас перажываем. І калі мы нешта зможам і можам для вас зрабіць у гэтым плане, мы гатовы». Зала на гэта таксама адрэагавала апладысментамі. «Нам гэта рашэнне даецца няпроста, я ўвогуле не прымаю, калі нашу ўкраінскую зямлю некаторыя спрабуюць выкарыстоўваць як разменную манету. Украіна заўсёды будзе моцнай, квітнеючай і адзінай. Але трэба ўмець дамаўляцца. Потым вырашым, хто вінаваты. Вось гэта пытанне давайце пакінем нашым дзецям, няхай яны потым з цягам часу (вялікае лепш бачыцца на адлегласці) вырашаць, хто вінаваты. Сёння трэба спыніць братазабойчую вайну».

Прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка падзякаваў беларускаму боку за стварэнне ўмоў для работы мінскай перагаворнай пляцоўкі. Кіраўнік украінскай дзяржавы расказаў, як беларускі лідар пайшоў яму насустрач у адказ на просьбу арганізаваць у Мінску перагаворы па спыненні ваеннага канфлікту. Затым — шматгадзінныя перагаворы. «У Мінску былі падпісаны дакументы, якія назаўсёды ўвойдуць у падручнікі дыпламатыі. Яны называюцца мінскімі пагадненнямі», — падкрэсліў Пётр Парашэнка.

«Ці давяраю я Лукашэнку? На сто працэнтаў. І мы пра гэта сёння гаварылі», — заявіў украінскі лідар.

Паводле яго слоў, місія кіраўніка беларускай дзяржавы, як і Беларусі ў цэлым, вельмі важная. «Трохбаковая кантактная група працуе ў Мінску. І Беларусь робіць усё, што можа, каб арганізаваць гэту работу, — сказаў Пётр Парашэнка. — Таму я хачу падзякаваць Аляксандру Рыгоравічу, беларускаму народу, Мінску».

СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ ЯК НАДЗЕЙНЫЯ ПАРТНЁРЫ

На першай частцы сустрэчы, яшчэ да прыбыцця лідараў, былі падпісаныя шэсць дакументаў аб супрацоўніцтве абласцей Беларусі і Украіны. Пазней былі падпісаныя міждзяржаўнае пагадненне аб рэадмісіі, план кансультацыі паміж знешнепалітычнымі ведамствамі дзвюх краін і пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы фізічнай культуры і спорту паміж адпаведнымі міністэрствамі.

Прысутныя — а гэта кіраўнікі адміністрацый рэгіёнаў, органаў дзяржаўнага кіравання і прадстаўнікі бізнесу — абмяркоўвалі беларуска-ўкраінскае ўзаемадзеянне, знаёмілі адно аднаго з умовамі для інвеставання, казалі пра поспехі і перспектывы прамысловай кааперацыі, супрацоўніцтва ў сферы вышэйшай адукацыі. Досыць жывыя зносіны працягваліся падчас перапынкаў у кулуарах.

Пра каласальны запыт грамадства на далейшае развіццё адносін і ўмацаванне традыцый сяброўства і добрасуседства сказаў у сваім выступленні і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Паміж намі не існуе невырашальных праблем — Мінск і Кіеў заўсёды знаходзілі ўзаемапрымальныя рашэнні», — падкрэсліў ён.

Перад прыбыццём на пасяджэнне кіраўнікі дзяржаў правялі перагаворы ў фармаце «сам-насам», дзе абмеркавалі ўсе актуальныя кірункі супрацоўніцтва, якія патрабуюць іх увагі.

«Думаю, па выніках перагавораў будуць расстаўлены неабходныя акцэнты па ўсіх пытаннях, якія нас цікавяць, — пракаментаваў вынікі размовы з украінскім калегам Прэзідэнт Беларусі. — Падкрэслю, што беларуска-ўкраінскі дыялог на самым высокім узроўні носіць шчыры і даверны характар. Мы можам у канструктыўнай атмасферы абмяркоўваць любыя, часам вельмі складаныя, тэмы».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўсе дамоўленасці і рашэнні з лідарам Украіны выконваюцца. Для гэтага задзейнічаны ўвесь інструментарый, уключаючы работу Міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве.

Разам з тым змястоўнасць беларуска-ўкраінскіх адносін у многім непасрэдна залежыць ад вынікаў узаемадзеяння на рэгіянальным узроўні, упэўнены беларускі лідар. «Ніколі не памрэ супрацоўніцтва паміж дзяржавамі і народамі, калі яно завязана на нізы, калі яно завязана непасрэдна на рэгіёны, — дадаў ён. — Таму гэта вялікая справа, якую мы пачалі, — фундамент для таго, каб нашы адносіны паміж беларусамі і ўкраінцамі існавалі вечна».

ВЫЙСЦІ НА 10 МІЛЬЯРДАЎ ДОЛАРАЎ

Аляксандр Лукашэнка назваў Украіну не толькі добрым сябрам для Беларусі, але і адным з найважнейшых палітычных і гандлёва-эканамічных партнёраў. Ён прывёў лічбы станоўчай дынамікі росту ўзаемнага тавараабароту. «Аднак упэўнены, што мы здольныя зрабіць значна больш, — сказаў беларускі Прэзідэнт. — Патэнцыял Беларусі і Украіны дазваляе рэалізаваць складаныя і значныя па сваім маштабе праекты ў розных абласцях эканомікі. Мы дамовіліся з Прэзідэнтам Украіны сур'ёзна папрацаваць, каб ужо зараз, не марудзячы, кардынальна змяніць сітуацыю і выйсці на намечаны рубеж у 8, а потым і ў 10 мільярдаў долараў».

Найбольш перспектыўнымі напрамкамі міждзяржаўнага супрацоўніцтва ён назваў сельскую гаспадарку, нафтахімічны комплекс, гуманітарную і навукова-тэхнічную сферы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў таксама ўвагу на значны патэнцыял супрацоўніцтва ў транспартнай лагістыцы. «Больш эфектыўнае выкарыстанне нашымі краінамі геаграфічных пераваг будзе садзейнічаць паспяховай рэалізацыі розных праектаў у рамках мультымадальнага транспартнага калідора Балтыйскае мора — Чорнае мора, — лічыць ён. — Важна ўключыць яго чыгуначны складнік, рачное суднаходства і інтэграваць марскія парты Украіны ў лагістычныя ланцужкі».

У гандлёва-эканамічныя сувязі паміж дзвюма краінамі ўцягнута значная колькасць суб'ектаў гаспадарання. У Беларусі налічваецца каля трохсот сумесных кампаній з украінскім капіталам. Ва Украіне дзейнічае каля ста прадпрыемстваў з беларускім удзелам. «Агульны аб'ём інвестыцый, укладзены ў праекты, якія рэалізуюцца нашай краінай на тэрыторыі Беларусі і Украіны, у 2017 годзе перавысіў 1,2 мільярда долараў. Па выніках першага паўгоддзя бягучага года склаў больш за паўмільярда долараў, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Толькі летась ва Украіне на сумесных зборачных вытворчасцях выпушчана больш за дзе тысячы трактароў, 90 камбайнаў і 500 ліфтаў».

«Без удзелу рэгіёнаў нашых краін праекты ў галіне кааперацыі былі б пазбаўлены практычнага сэнсу», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Аднак мы можам працаваць не толькі на рынкі сваіх дзяржаў. Напэўна, такі падыход быў занадта простым для нашых эканомік, якія знаходзяцца ў самым сэрцы Еўропы, на перакрыжаванні асноўных гандлёвых шляхоў, і ўдзельнічаюць у буйных праектах рэгіянальнай інтэграцыі, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Акцэнт трэба рабіць на стварэнні сумесных прадпрыемстваў, якія выпускаюць прадукцыю для рынкаў трэціх краін».

НЕ ХЛЕБАМ АДЗІНЫМ

Прэзідэнт таксама заўважыў, што не толькі эканоміка, але і цесныя гуманітарныя сувязі аб'ядноўваюць нашы краіны і народы. Актыўна развіваецца двухбаковае ўзаемадзеянне ў сферах спорту, навукі і адукацыі.

«У абедзвюх дзяржавах створаны ўсе неабходныя ўмовы для захавання ідэнтычнасці нацыянальных дыяспар. Дні культуры Украіны ў Беларусі, якія з поспехам прайшлі гэтым летам у Мінску і рэгіёнах, сталі незабыўнай падзеяй», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Карыстаючыся выпадкам, ён нагадаў пра другія Еўрапейскія гульні, якія ў 2019 годзе адбудуцца ў Беларусі. «Мы будзем рады бачыць на іх вашых спартсменаў і, абсалютна дакладна, будзем хварэць за іх паспяховае выступленне гэтак жа, як і за беларускіх атлетаў, — паабяцаў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Бо спорт і ўвогуле мерапрыемствы такога ўзроўню з'яўляюцца моцным аб'яднальным фактарам».

Прэзідэнт Беларусі выказаў упэўненасць, што міжрэгіянальнае супрацоўніцтва набудзе новы подых пасля праведзеных у гэтыя дні ў Гомелі перагавораў і першага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Украіны.

«Яшчэ раз падкрэслю, Беларусь настроеная на прадметны і канструктыўны дыялог са сваімі ўкраінскімі сябрамі па любых кірунках. Няма забароненых тэм. Наша краіна імкнецца да шырокафарматнага супрацоўніцтва з Украінай ва ўсіх сферах у духу даверу і ўзаемнай падтрымкі», — рэзюмаваў беларускі лідар.

Пра давер паміж краінамі казаў і Прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка. «Паміж Украінай і Беларуссю ёсць давер, паміж Лукашэнкам і Парашэнкам ёсць давер. І я абсалютна перакананы, што гэты давер выльецца ў бяспеку, надзейнасць, дружбу і супрацоўніцтва», — сказаў ён на сустрэчы ў фармаце «сам-насам» з беларускім калегам. Ён дадаў, што мяжа паміж Беларуссю і Украінай павінна быць выключна мяжой міру, дружбы і надзейнасці. «І вы, і я робім да гэтага максімальныя намаганні», — адзначыў Пётр Парашэнка.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,
г. Гомель.

Змяняць стаўкі...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэта інфармацыя павінна ўключаць звесткі пра суму запазычанасці па крэдытным дагаворы ў частцы асноўнай сумы доўгу па крэдыце, працэнтах за карыстанне ім, а таксама ў частцы пратэрмінаванай запазычанасці па асноўнай суме доўгу па крэдыце, працэнтах за карыстанне ім.

Банкі павінны нагадваць аб праблемных крэдытах

Зараз кліенты банкаў змогуць датэрмінова поўнасцю або часткова пагашаць спажывецкія крэдыты з выплатай працэнтаў за тэрмін карыстання крэдытам без папярэдняга паведамлення банку. Пры гэтым спагнанне няўстойкі — штрафу, пені — за датэрміновае вяртанне крэдыту не дапускаецца. Таксама банк павінен забяспечыць крэдытаатрымальнікам як мінімум адзін варыянт пагашэння крэдыту без збору і плацяжоў.

Банкі абавяжуць паведамляць кліентам аб пратэрмінаванай запазычанасці па крэдыце не пазней чым праз 30 дзён з дня яе ўтварэння, а паручыцелю — не пазней чым за 60 дзён. Гэтую інфармацыю банкі павінны будуць даваць бясплатна.

Банкаўская таямніца

Што датычыцца інфармацыі аб фізасобах, якая складае банкаўскую таямніцу, то яе могуць перадаваць іншым асобам у выпадках, калі банкі саступаюць свае патрабаванні па крэдытных дагаворах іншым юрыдычным асобам альбо калі крэдытныя дагаворы забяспечаны залогам. Акрамя гэтага, змяніліся спосабы перадачы такой інфармацыі, тлумачыць **намеснік начальніка ўпраўлення законапраектных работ і экспертызы нарматыўных прававых актаў галоўнага юрыдычнага ўпраўлення Нацыянальнага банка Віталь САРОКІН.**

Раней у Банкаўскім кодэксе была замацаваная норма, што такая інфармацыя даецца толькі па пісьмовым запыце. Згодна з новымі правіламі, яе можна будзе атрымаць з дапамогай электроннага запыту або на падставе пагаднення паміж банкам і дзяржорганам, які можа мець доступ да такой інфармацыі.

У абноўленым Банкаўскім кодэксе вызначаны выпадкі, пры якіх перадача банкам звестак не будзе разглядацца як парушэнне банкаўскай таямніцы. Да такіх сітуацый, у прыватнасці, адносіцца зварот банка ў суд, пракуратуру, органы крымінальнага пераследу, да натарыусаў або адвакатаў для абароны і (або) аднаўлення сваіх правоў і законных інтарэсаў.

Ліквідацыя банкаў

Што датычыцца спынення дзейнасці банка, то ў кодэксе замацоўваецца норма аб тым, што банк з моманту адклікання ліцэнзіі павінен будзе вяртаць банку-адпраўніку грашовыя сродкі, якія паступаюць на карысць кліентаў, а таксама грошы, залічаныя ў выніку тэхнічнай памылкі. Гэтая норма накіравана на абарону інтарэсаў кліентаў, падкрэсліла Алена Орда.

Зараз зменіцца парадак ліквідацыі ўстановы, ініцыяванай самім банкам. У прыватнасці, для самаліквідацыі больш не спатрэбіцца згода Нацыянальнага банка. Замест гэтага адпаведныя органы банка павінны праінфармаваць пра такое рашэнне Нацбанк. Цяпер у кодэксе прапісана, што стварэнне банка з адным заснавальнікам не дапускаецца, мінімум іх павінна быць двое.

Пры безнаяўных разліках стане магчымым прымяненне новых для краіны відаў, якія шырока выкарыстоўваюцца ў міжнароднай банкаўскай практыцы: банкаўскае плацежнае абавязацельства і прамое дэбетаванне рахунку. «Адна з ключавых пераваг банкаўскага плацежнага абавязацельства — адсутнасць неабходнасці перадачы папяровых дакументаў у банк. Гэта можа істотна паскорыць паступленне экспартнай выручкі на рахункі экспарцёраў», — растлумачыла Алена Орда. Прамое дэбетаванне рахунку дазволіць забяспечваць абарону правоў спажыўца тавараў і паслуг і вяртанне яму грашовых сродкаў у выпадку іх нездавальняючай якасці.

У абноўленым Банкаўскім кодэксе таксама ўдакладняецца, што крэдыты насельніцтву павінны выдавацца толькі ў беларускіх рублях.

Сяргей КУРКАЧ.

АДЛІК НОВАГА ЧАСУ

У межах Форуму рэгіёнаў Беларусі і Украіны адбылося 13-е пасяджэнне рабочай групы па павелічэнні ўзаемнай прысутнасці на рынках сельскагаспадарчай, харчовай і іншай прадукцыі. За 8 месяцаў года тавараабарот у сегменце вырас на 23 % да ўзроўню мінулага года, адзначыў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Іван СМІЛЬГІНЬ:

— У Гомелі былі разгледжаны пытанні сумеснага ветэрынарнага кантролю і кантролю за абаротам насення, развіцця племянной жывёлагадоўлі. У нас ёсць рэзервы для падтрымання прысутнасці тавараў на рынках абедзвюх краін. Сёння Беларусь працуе ў межах Еўразійскага эканамічнага саюза. Нашы калегі з Украіны таксама працуюць згодна з дагаворамі з іншымі краінамі. Але ж пры гэтым мы плённа супрацоўнічаем. Невырашальных пытанняў няма.

Намеснік міністра аграрнай палітыкі і харчавання Украіны Віктар ШАРАМЕТ дадаў, што рост аб'ёмаў паставак у той ці іншы бок залежыць ад бізнесу, якому трэба толькі даць «зялёную вуліцу»:

— Беларусь для Украіны — буйны гандлёвы партнёр не толькі ў сельскай гаспадарцы, але і ў іншых галінах. Мы знайшлі шляхі, як вырашаць праблемныя пытанні, што існавалі ў нас. Дробныя перашкоды, напрыклад цяжкасці пры афармленні на мяжы транзітных грузаў, адрозненні ў сертыфікацыі тавараў ветэрынарнымі службамі, паступова пераадольваюцца.

Першы намеснік Кіеўскай абласной дзяржадміністрацыі Андрэй АНІСІМАЎ гаворыць, што сталічны рэгіён Украіны мае ўстойлівыя адносіны з Гомельшчынай, а форум надасць стымул рэалізацыі новых праектаў у сферах бізнесу, транспарту, лагістыкі:

— Мы актывізавалі наша двухбаковае супрацоўніцтва. Больш за 30 розных прадпрыемстваў у Кіеўскай вобласці сёння супрацоўнічаюць з прадпрыемствамі Беларусі. Адзін з праектаў, які мы прапанавалі, — пра змяненне статусу з міждзяржаўнага на міжнародны пунктаў пераходу «Вільча» і «Аляксандраўка». Гэта ўчастак агульнага транснацыянальнага калідора Адэса — Кіеў — Мінск — Клайпеда, які вядзе ад порта да порта. Змяненне дазволіць значна скараціць шлях, хутчэй дастаўляць грузы, а значыць, павялічыць аб'ёмы экспарту нашых прадпрыемстваў. За паўтара-два гады, якія патрабуюцца на рэканструкцыю інфраструктуры, праект можна рэалізаваць. Таксама нашы рэгіёны маюць намер сумесна працаваць над чарнобыльскай праблематыкай.

Кіраўнік Сумскай аблдзяржадміністрацыі Мікалай КЛАЧКО адзначае:

— Для нас Беларусь становіцца ўсё больш важным партнёрам. Высокая якасць беларускіх тавараў робіць іх папулярнымі ва Украіне. Але галоўнае, што ёсць давер адно да аднаго. Я ўпэўнены, у нас шмат формаў для кааперацыі, і мы гатовы працаваць з Беларуссю і пашыраць супрацоўніцтва, у тым ліку ў машынабудаванні, аграрнай сферы, перапрацоўчай прамысловасці і па іншых напрамках. Таксама вы для нас дэманструеце пазітыўны вопыт узаемадзеяння з такім глабальным партнёрам, як Кітай.

Кіраўнік Запарожскага рэгіёна Канстанцін БРЫЛЬ разлічвае на ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва ў сферы машынабудавання і металургіі:

Фота БелТА.

— Мне было вельмі прыемна пабачыць у Беларусі добрыя дарогі і прыязнае стаўленне. Напярэдадні форуму я трапіў на Беларускі металургічны завод, дзе ўбачыў, што прадпрыемства сур'ёзна мадэрнізавалася і выпускае прадукцыю, асартымент якой зусім іншы, чым той, які пануюць металургічныя гіганты Запарожжа. Такім чынам, металургі двух рэгіёнаў могуць узаемна дапаўняць адзін аднаго, а не канкурыраваць. Можна знайсці пункты судакранання ў энергетыцы, перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі, машынабудаванні. Пасля гэтай сустрэчы мы больш дэталёва падыдзем да канкрэтных прапаноў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ІНТУІЦЫЯ АБО ФАКТЫ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Інтэлектуальныя здольнасці настаўніка, хутчэй за ўсё, маюць большае значэнне, чым яго адукацыя. Зразумела, прадметныя веды настаўніку неабходныя, але яны павышаюць паспяховасць школьнікаў толькі ў комплексе з шэрагам іншых характарыстык педагога, а не самі па сабе. Адной з іх можна лічыць імкненне настаўніка аказаць падтрымку вучню, павага да яго асобы. Аказалася, што такі падыход асабліва моцна ўплывае на развіццё крытычнага і творчага мыслення вучняў, а таксама на іх эмацыянальнае развіццё.

Яшчэ адной характарыстыкай настаўніка, якая істотна ўплывае на поспехі вучняў, з'яўляюцца яго чаканні ў адносінах да іх. Было праведзена даволі шмат даследаванняў на гэту тэму. Практычна ўсе яны паказваюць на высокі памер эфекту гэтага фактару. Асабліва ярка выяўляецца негатыўны ўплыў чаканняў педагога ў тых школах, дзе практыкуецца дыферэнцыяцыя дзяцей па іх здольнасцях.

Ад вучняў, ацэненых як няздольныя, настаўнікі не чакаюць паспяховай вучобы. І наадварот, пазітыўны эфект назіраецца тады, калі настаўнік верыць у магчымасць развіцця вучня і дасягнення ім больш высокіх вынікаў.

НЕ МАСКІРАВАЦЬ ПРАБЛЕМЫ

Адной з самых аўтарытэтных крыніц з'яўляецца фундаментальная кніга новазеландскага прафесара Джона Хэці «Бачнае навучанне». Гэта самае маштабнае ў свеце даследаванне ў галіне доказнай педагогікі, якое змяшчае адказы на крытычна важныя пытанні сучаснай адукацыі. Як палепшыць вынікі школьнага навучання? Што і ў якой ступені ўплывае на навучальныя поспехі вучняў? Як зрабіць навучальны працэс найбольш дзейсным і прывесці вучняў да высокіх вынікаў? Які ўплыў на вынікі навучання аказваюць асоба вучня, яго сям'я, настаўнік, вучэбная праграма і метады выкладання?

Кацярына КУКСО: «У вучняў трэба верыць...»

Джон Хэці адзначае: «...праблемы, якія выклікаюць самыя гарачыя спрэчкі ў грамадстве, маюць найменшы памер эфекту. Цікава, чаму такія пытанні, як колькасць і склад школьнікаў у класе, неабходнасць пакідаць вучняў-няўдачнікаў на паўторнае навучанне, магчымасць выбару школы, заняткі ў летніх школах і ўвядзенне школьнай формы, спараджаюць такія гарачыя дэбаты. Падобныя касметычныя перабудовы праводзяцца занадта часта і толькі маскіруюць праблемы».

Прааналізаваўшы за 15 гадоў вынікі больш як 50 000 даследаванняў ва ўсім свеце з сумарным ахопам больш за 86 мільёнаў школьнікаў, Джон Хэці распрацаваў своеасаблівы «барометр», які паказвае ўплыў канкрэтных фактараў на навучанне. Чым вышэйшае значэнне паказчыка, тым большы ўплыў на якасць навучання аказвае гэтая прычына. Напрыклад, найбольш высока ім ацэньваецца існаванне зваротнай сувязі паміж настаўнікам і вучнем (толькі разгорнутая зваротная сувязь істотна карэлюе з высокімі дасягненнямі), ну і, канешне, настаўніцкія чаканні. Педагог павінен верыць, што ўсе дзеці могуць вучыцца і развівацца, што навучальныя вынікі любога з іх могуць змяніцца да лепшага, паколькі не з'яўляюцца раз і назаўсёды зададзенай велічынёй.

Разам з тым ні фінансаванне школ, ні напаўняльнасць класаў, ні іх дзяленне на падгрупы, ні фарміраванне груп па здольнасцях не аказваюць істотнага ўплыву на акадэмічныя вынікі.

«Бачнае навучанне» — выдатны арыенцір для настаўнікаў і бацькоў, які дазваляе параўноўваць шматлікія інавацыі, якія сёння ўкараняюцца ў сучасных школах. Кацярына Куксо ўпэўненая, што педагогіка на аснове даных патрэбная як для кіравання школай, так і для кіравання ўрокам. Рашэнні трэба прымаць, абапіраючыся на праверэныя вынікі даследаванняў...

ПАПРАЦУЕМ НАД МАТЫВАЦЫЯЙ

Між іншым, Джон Хэці таксама пацвердзіў моцнае ўздзеянне на паспяховасць школьніка сацыяльна-эканамічнага статусу сям'і, дамашняга асяроддзя і ўцягнутасці бацькоў у вучобу дзяцей. На думку даследчыка, уплыў сям'і мог быць нашмат большы, калі б бацькі ўмелі размаўляць з дзецьмі «на мове педагогікі». Вопыт самога Хэці паказвае, што засваенне мовы педагогікі і ўключэнне бацькоў у школьнае жыццё прыносяць плён.

Да гэтай жа думкі прыйшоў і **настаўнік беларускай мовы і літаратуры Ліцэя БДУ Зміцер МАКАРЧУК**. Але як знайсці з бацькамі агульную мову? Асабліва калі ты малады педагог і, не маючы ўласных дзяцей, яшчэ не можаш быць аўтарытэтам у пытаннях выхавання?

— Уявіце сабе сітуацыю: мне 23—24 гады і я кажу людзям, старэйшым за мяне: «Зараз я навучу вас, як выхоўваць вашых дзяцей!» У адказ можна было пачуць усё што заўгодна. Але я цудоўна разумею, што паводзіны, манеры і ўстаноўкі бацькоў перадаюцца дзецям. І перш чым працаваць над матывацыяй дзяцей, трэба працаваць над матывацыяй іх бацькоў. Таму я вырашыў наладжваць масты праз «Бацькоўскі кінаклуб». Патрабавалася пэўная доля нахабства і самаўпэўненасці (давайце назавём іх харызмай), каб увасобіць сваю задуму ў жыццё. Я пачынаў работу кінаклуба ў школе ў гарадскім пасёлку, а цяпер працягваю свой досвед у Ліцэі БДУ. Канешне, калі прызначыць у сельскай школе сустрэчу з бацькамі, скажам, у сераду ў верасні, то ў вас не будзе аніякіх шанцаў. Але адкуль гэта мог ведаць малады хлопец, які 24 гады пражыў у горадзе? — усміхаецца Зміцер. — У вёсцы час для пасяджэнняў кінаклуба — гэта канец лістапада — пачатак сакавіка. А вось у горадзе мы змаглі за навучальны год праглядзець і абмеркаваць прыблізна дзесяць фільмаў. Звычайна я прапаную разам з дзецьмі паглядзець дома пэўную кінастужку. Не чарговы бандыцкі серыял, а добры мастацкі фільм. Гэта зойме паўтары-дзве гадзіны і аб'яднае сям'ю.

Кіно — мастацтва, даступнае кожнаму, але яго таксама трэба ўмець «чытаць». Кнігу можна проста прагартаць, прапусціць тое, што табе нецікава. Калі мне дзеці кажуць: «А навошта мне чытаць «Вайну і мір», калі можна прачытаць кароткі пераказ рамана на чатырох старонках?», я ім адказваю: «Калі б Леў Мікалаевіч хацеў нам штосьці сказаць на чатырох старонках, то ён бы так і зрабіў, бо ў яго ёсць і аповесці, і невялікія апавяданні». Рэжысёр можа здымаць дзесяць гадзін, а на экране застануцца ўсяго паўтары хвілінкі ад знятага матэрыялу. І тут мае значэнне ўсё: кожны рух, кожны позірк. Мы разбіраемся, чаму адзін герой мае імя, а другі застаецца безыменным, чаму той ці іншы персанаж з'яўляецца менавіта ў гэты момант? Чаму толькі адзін раз? У мяне ёсць спіс пытанняў і нарэзка фрагментаў з гэтага фільма — урыўкі па 30—45 секундаў, на якія я хацеў бы звярнуць асаблівую ўвагу. І толькі напрыканцы мы разважаем, а пра што гэты фільм насамрэч?

Зміцер заўважыў, што незалежна ад таго, дзе размешчана школа (у невялікім пасёлку, у раённым цэнтры або ў сталіцы), колькасць зацікаўленых бацькоў у класе заўсёды аднолькавая — прыкладна 45—50 працэнтаў.

— Маёй першапачатковай мэтай было паўплываць на матывацыю дзяцей, але ўва што ўсё гэта выльецца, я не мог прадбачыць, — прызнаецца ён. — Матывацыя аказалася толькі маленечкай дробяззю... Усе прызвычаіліся, што ў школу трэба ісці, каб паслухаць пра сваіх дзяцей, здаць грошы ці выправіць адзнаку... А тут настаўнік хоча, каб мы з ім нешта абмяркоўвалі, як сябры. Няўжо настаўнік можа быць сябрам? Я не чакаў, што можна выйсці на такі ўзровень даверу паміж педагогам і бацькамі! Цяпер, калі ўзнікаюць пытанні з выхаваннем дзяцей, бацькі прыходзяць да мяне і мы разам разважаем, што з гэтым рабіць. І ў гэтым галоўная каштоўнасць кінаклуба. У мяне няма правільнага адказу, я не рэжысёр... Значыць, аўтаматычна ўсе адказы ў аўдыторыі становяцца правільнымі. А ў выхаванні хіба не так? Бацькі сталі маімі паплечнікамі...

ПАЧУЦЬ АДНО АДНАГО

— Як часта здараецца? Бацькоў «загрузілі» ў школе, а тыя прыйшлі і выплюхнулі ўсё гэта на сваё дзіця. У нас жа не вучаць быць бацькамі... Для таго каб кіраваць аўтамабілем, я павінен здаць экзамен, а для бацькоўства нічога не трэба, — канстатуе Зміцер Макарчук. — Звычайная ўстаноўка — «Я нарадзіў, значыць, я маю права». Акрамя фізічнай бяспекі, ёсць яшчэ маральна-эмацыянальная бяспека, таму што ёсць маральна-эмацыянальны гвалт. Дык вось, некаторыя бацькі ідуць на бацькоўскія сходы і рыхтуюцца, што іх будуць «гвалціць»: не здалі грошы, дзе нам узяць мэблю, тэлевізар, як адрамантаваць кабінет і гэтак далей. А на кінаклубе пануе абсалютная бяспека. Яны ведаюць, што мы проста будзем абмяркоўваць творы мастацтва. Ці хочуць бацькі чаму-небудзь навучыцца? Паверце — хочуць!

Але калі мы абмяркоўваем з бацькамі фільмы, я вучу іх не аналізаваць, а менавіта абмяркоўваць. Калі павышаецца лаяльнасць да інстытута школы ўвогуле, павышаецца і лаяльнасць да прадмета, які я выкладаю. Беларуская мова — адзін з найважнейшых элементаў сістэмы. Яны чуюць яе ад мяне пастаянна і разумеюць, што яна зусім не вясковая і не няшчасная. На беларускую мову перакладзены кінашэдэўры.

Ці прапаноўвалі мне бацькі і дзеці штосьці паглядзець? Сапраўдным адкрыццём стаў для мяне індыйскі фільм 2016 года «Дангал» — дзве з паловай гадзіны абсалютна геніяльнага мастацтва. Дзеці прапанавалі фільм «Маленькая міс Шчасце». Дзеці ўвогуле выказваюць такія цікавыя думкі! Яны звяртаюць увагу на моманты, якія дарослыя не заўважаюць. Дзякуючы кінаклубу мы навучыліся давяраць адно аднаму, камунікаваць, збірацца разам. Гэта ўніверсальны камунікатыўны інструмент. Калі я хачу прыняць рашэнне, я магу прыняць яго сам, а магу вынесці на абмеркаванне. Так, гэта займае больш часу, але, калі мы хочам навучыць дзяцей абмяркоўваць, трэба ўвесь час з імі абмяркоўваць. Усё так проста і так складана адначасова.

Камунікацыя патрабуе шмат уменняў: не толькі гаварыць, але і слухаць. Я абавязкова звяртаю ўвагу на педагагічныя і псіхалагічныя моманты. Калі маці крычыць на сына, чаму яна гэта робіць? Звяртаю ўвагу на моманты, важныя для стасункаў бацькоў са сваімі дзецьмі. Ці чуюць яны адно аднаго? Увогуле, я ўпэўнены, што кожны чалавек, з якім мы сустрэліся, кожны фільм, які мы паглядзелі, уплываюць на нас: так уладкавана жыццё. Як адгукнецца мой кінаклуб праз 5-10 гадоў, я пакуль не ведаю, але перакананы, што гэты час не страчаны для ўсіх дарэмна...

Надзея НІКАЛАЕВА.